ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1989
ЧАЦВЕР
16
ЛІСТАПАДА
№ 30(1623)

ЗАПРАШАЛЬНЫ БІЛЕТ

## Дарагі таварыш!

Табе аказаны давер прадставіць сваю пярвічную камсамольскую арганізацыю на VII канферэнцыі, на якую сабраліся лепшыя прадстаўнікі трыццацісямітысячнага атрада камсамольцаў нашага раёна.

Са справаздачнага даклада райкома ЛКСМБ, з выступленняў ты пачуеш шмат цікавых прыкладаў аб працоўных справах моладзі, аб перадавіках вытворчасці, лепшых прадстаўніках студэнцтва. Табе неабходна прыняць актыўны ўдзел у вызначэнні праграмы дзеянняў раённага камсамола на будучае.

Мы менавіта тая сіла, якая сёння найбольш востра адчувае адказнасць за заўтрашні дзень.

І ў новых справах, якія чакаюць камсамольскую арганізацыю, вельмі важна не страчваць аганёк надзеі, паказваць сапраўдны грамадзянскі падыход да работы, усімі сіламі падтрымліваць перабудову, садзейнічаць абнаўленню камсамола.

Вельмі важна, каб кожны з нас выкарыстоўваў тыя перспектывы, якія нам адкрываюцца, быў ударнай, ініцыятыўнай сілай перабудовы.

Мы чакаем ад цябе дзелавой, зацікаўленай, прынцыповай размовы, канкрэтных прапаноў па паляпшэнню работы раённай камсамольскай арганізацыі.

Няхай твае справы будуць важкім укладам у славуты летапіс Ленінскага камсамола.

МАСКОЎСКІ РАЙКОМ ЛКСМБ
г. МІНСКА.

КРОК ДА КАНФЕРЭНЦЫІ

Тры гады прайшлі са дня правядзення VI справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі Маскоўскага раёна. Якімі былі яны? Плённымі, насычанымі, складанымі. Давялося развітацца са старымі метадамі работы і ўзяць на ўзбраенне новыя, якія дыктавала перабудова.

Што зроблена за гэты час? Гістарычнай даведкай можа стаць пералік пытанняў, якія абмяркоўваліся на дванаццаці пленумах РК ЛКСМБ:

— Аб праекце Статута ВЛКСМ;

— Аб ходзе выканання пастановы VI Пленума РК ЛКСМБ ад 14.03.86 г. «Аб задачах райкома ЛКСМБ па кіраўніцтву раённай піянерскай арганізацыяй у святле рэформы агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы»;

— Аб выніках XX з'езда ВЛКСМ і задачах раённай камсамольскай арганізацыі;

— Аб задачах камітэта камсамола раёна па працоўнаму выхаванню навучэнцаў у святле патрабаванняў рэформы агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы;

— Аб рабоце камітэтаў камсамола раёна па перабудове ідэалагічнай работы ў святле патрабаванняў XX з'езда ВЛКСМ;

— Справаздача бюро райкома камсамола па кіраўніцтву перабудовай работы пярвічных камсамольскіх арганізацый;

— Аб праекце бюджэту раённай камсамольскай арганізацыі на 1989 год;

— Аб задачах раённай камсамольскай арганізацыі па развіццю ініцыятывы і самастойнасці школьных камсамольскіх арганізацый;

— Аб рабоце камітэтаў камсамола раёна па развіццю маладзёжнай ініцыятывы;

— Аб мерапрыемствах РК ЛКСМБ па падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Саветы народных дэпутатаў.



НЕАДКЛАДНА!

## Мы наш, мы новы... або Праграма «мірнага перавароту»

**Ствараць свае праграмы ў апошнія гады стала справай гонару ледзь не кожнай існуючай у нашай краіне арганізацыі, нават самай дробнай, незаўважнай і неўплывовай. Што ж датычыць камсамола, то ў яго недрах зарадзілася, відаць, не адна сотня планаў рашучых дзеянняў. Толькі за год у камсамольскай арганізацыі БДУ імя У. І. Леніна было створана дзве праграмы. На памылках вучацца, каб больш не паўтараць. І тым не менш у гэтай размове за рэдакцыйным сталом прадстаўнікоў апарату — сакратара камітэта камсамола Віктара ШАДУРСКАГА і яго калегі з факультэта прыкладной матэматыкі Алены БЯЛЯЕВАЙ з радавым камсамольцам, студэнтам філалагічнага факультэта Сяргеем ШАПРАНАМ, часам узнікала шмат спрэчных, палярных думак. Поўнага ўзаемаразумення паміж «вярхамі» і «нізамі» наконт новай мадэлі камсамола не было. Недасканаласць праграмы? Адсутнасць кантакту? Плюралізм меркаванняў? Ці ўвогуле крызіс?**

С. ШАПРАН: Сёння ўсюды, куды ні кінь — праблемы, у камсамоле найбольш. Дзе ж выйсце? Навошта дэклараваць тое, што вядома, калі камсамол бяссільны нешта змяніць?

В. ШАДУРСКІ: Сапраўды, істотна ўплываць на жыццё грамадства ў цэлым мы не можам. Каб штосьці змяніць, патрэбен шэраг эканамічных, у першую чаргу, мер, а таксама заканадаўчых і палітычных. Гэта не ў кампетэнцыі камсамольскай арганізацыі універсітэта. У той жа час, як грамадзяне сваёй краіны, мы, камсамольцы, не можам стаяць убаку ад праблем, заплюшчваць вочы на іх. Таму ў нашай праграме два ўзроўні. Грамадска-палітычны — абстрактны — і канкрэтны, у выглядзе нашых рэальных прапаноў, рэальных спраў. Між іншым, «палітыкі» нам раней і не хапала. Мы займаліся выкананнем нейкіх мясцовых задач, планаў, а ў вялікую палітыку нас не дапускалі. У камсамола не было палітычнай арганізацыі. Было ведамства па справах моладзі. Сёння моладзь смела спрабуе ўмяшацца ў палітычныя справы. «Стары» камсамол да гэтага не падрыхтаваны. Патрэбна новая мадэль нашага маладзёжнага саюза. Гэтае пытанне, дарэчы, паставілі маладзёжныя арганізацыі многіх сацыялістычных краін.

С. ШАПРАН: Мне здаецца, застарэла сама структура ВЛКСМ. Ці нельга стварыць камсамол як арганізацыю па інтарэсах? Ва універсітэце, напрыклад, для гэтага вельмі спрыяльныя ўмовы. У нас шмат прадстаўнікоў нефармальных арганізацый. Чаму ж не аб'яднаць іх пад сцягам камсамола? У іх жа цікава. А камсамол застаецца вялікай масай, дзе людзі толькі фармальна запісаны.

В. ШАДУРСКІ: Мы стварылі ў камітэце камсамола універсітэта сектар прапаганды нацыянальнай культуры і мовы. Сюды ўваходзяць прадстаўнікі нефармалаў, дзейнічае пастаянная камісія. Пад яе кіраўніцтвам ужо праведзена некалькі мерапрыемстваў, у прыватнасці пасяджэнне клуба «Лёс Беларусі». Канфрантацыі з нефармаламі мы не шукаем і не хочам, хутчэй наадварот. Мы гатовы супрацоўнічаць у любой сферы. Аднак камсамол — арганізацыя палітычная, на першае месца павінны выступаць палітычныя інтарэсы. Для таго, каб змяніць сённяшняе жыццё, зрабіць яго больш дэмакратычным, проста лепшым, неабходна палітычная арганізацыя. Стыхійнасць у перыяд рэвалюцыйных пераўтварэнняў — дрэнны памочнік. Структурны прынцып не абавязкова павінен быць тэрытарыяльна-вытворчым, я з гэтым згодзен. Камсамольскія арганізацыі могуць узнікаць на базе клубаў, гурткоў, груп па інтарэсах. Але ж галоўным павінна заставацца палітыка...

С. ШАПРАН: І ўсё ж зараз у рэспубліцы ды і ў краіне назіраецца тэндэнцыя скарачэння членаў ВЛКСМ, а рады нефармалаў растуць, папаўняюцца за кошт моладзі. Я на ростанях.

В. ШАДУРСКІ: Я не супраць нефармальных арганізацый. Поста неабавязкова ствараць новыя грамадскія арганізацыі, лепш перабудаваць старыя, выкарыстаць іх гістарычную згуртаванасць.

С. ШАПРАН: Але ж за гады вучобы я не бачыў рэальных спраў камсамола. Калісьці я быў нават членам камітэта камсамола факультэта. Узначальваў культмасавы сектар. Як не спрабаваў, а зрабіць штосьці істотнае не мог, так усё зафармалізавана.

В. ШАДУРСКІ: Камсамол мяняецца, дакладней, павінен істотна змяніцца. Сёння мы ўжо ставім пытанне аб абароне правоў сваіх членаў, хоць мы не эканамічная арганізацыя і не можам, як, напрыклад, прафсаюз, значна дапамагчы камсамольцам матэрыяльна.

А. БЯЛЯЕВА: Я ў мінулым годзе таксама вырашыла было ўжо пакінуць камсамольскую работу. Цяжкая і няўдзячная праца. Але рaптам зразумела, што яшчэ можна нешта змяніць і, самае галоўнае, неабходна. І я засталася, засталася рабіць чарнавую работу. Без яе нельга. Трэба ж некаму арганізаваць. Вось кепска, што адсутнічае зваротная сувязь з камсамольцамі. Думаю, што наладзіць яе зможам толькі канкрэтнымі справамі. Калі выканаем праграму дзеянняў, то радавыя камсамольцы, убачыўшы рэальную работу, пойдуць за сваімі лідэрамі. Паверацъ у камсамол як у моцную, дзеючую сілу.

КАРЭСПАНДЭНТ: Выходзіць, праграма дзеянняў разлічана ў асноўным на «актыў». А радавым камсамольцам застаецца назіраць за ходам яе выканання?

В. ШАДУРСКІ: Не, не зусім так. Праграма не пакідае без работы і радавых камсамольцаў, але ёсць пэўныя пункты, якія акрэсліваюць сферу дзеянняў лідэраў. Зразумела, што кожны павінен канкрэтнымі справамі даказваць сваё права на лідэрства.

С. ШАПРАН: На жаль, такога ў жыцці няма. Ды і ўвогуле, чым я, камсамолец, адрозніваюся зараз ад некамсамольца. Тым, што плачу ўзносы. А што дае мне камсамол узамен?

(Заканчэнне на 4-й стар.).

ПЯЦЬ РАДКОЎ У СПРАВАЗДАЧУ

## Сведчыць статыстыка

Давайце параўнаем лічбы трох справаздачных гадоў, якія аддзяляюць нас ад дня правядзення VI камсамольскай канферэнцыі раёна. Не шукайце росту паказчыкаў. Сёння гэта не галоўнае. На першым плане — якасць работы. І калі ў гэтым годзе зменшылася колькасць пярвічных (202) і цэхавых (1889) камсамольскіх арганізацый (у 1987 годзе адпаведна 209 і 2046), то ўвага да іх з боку райкома, безумоўна, павысіцца.

*У структуры раённай камсамольскай арганізацыі* назіраецца тэндэнцыя росту колькасці камсамольскіх груп (1987—48; 1989—54).

*Якія ж лічбавы састаў Маскоўскай раённай камсамольскай арганізацыі г. Мінска?* Напрыклад, у мінулым годзе яна налічвала 40204 члены, а па даных на першага лістапада гэтага года — 37009.

У тым ліку па катэгорыях (першая лічба — 1987 г., другая — на 1 лістапада 1989 г.):

прамысловасць: 4553—3840;
транспарт: 426—315;
сувязь: 183—340;
будаўніцтва: 1268—390;
гандаль і грамадскае харчаванне: 959—744;
НДІ і канструктарскія бюро: 2252—2066;
ВНУ: 19224—21453;
тэхнікумы: 671—466;
школы: 2288—1787;
ПТВ: 3407—1883.

У плане работы РК ЛКСМБ ёсць такая графа: *развіццё маладзёжнага турызму*. Як сведчыць статыстыка, у 1987 годзе справа гэта была ў заняпадзе. За мяжу па турыстычных пуцёўках (толькі цэнтралізаваны абмен) трапілі ўсяго 137 чалавек. У наступным годзе маладзёжны турызм набывае сапраўдны размах. А сёлета ўсяго за дзесяць месяцаў колькасць турыстаў перакрыла ўсе мінулагоднія паказчыкі: цэнтралізаваны абмен — 75 чалавек, дэцэнтралізаваны — 264, унутрысаюзныя маршруты — 37, паездкі ў міжнародныя маладзёжныя цэнтры — 55. Дарэчы, мы не толькі ездзім самі, але і прымаем замежных турыстаў у сябе.

Райкому камсамола даводзіцца займацца і *арганізацыяй працоўнай чвэрці старшакласнікаў*. У час летніх канікулаў 1989 года вучні працавалі ў 18 загарадных і 22 гарадскіх лагерах працы і адпачынку, 19 рамонтна-будаўнічых брыгадах і працоўных атрадах школьнікаў. Усяго ў пятай працоўнай чвэрці ўдзельнічала сёлета 63,3 працэнта навучэнцаў агульнаадукацыйных школ.

АТАКУЕМ ФАРМАЛІЗМ!

# Быль пра стойкіх неалавяных салдацікаў



**Іван Іхненка, кіраўнік групы юных дэсантнікаў «Трывога» Маскоўскага раёна, два гады назад нечакана для ўсіх пакінуў працу фрэзероўшчыка на заводзе імя Арджанікідзе і пайшоў працаваць з малагодкамі. Прычыны? Маці часта гаварыла яму, што ў дзяцей да яго ёсць нейкая цяга. Сам Іван ніяк не можа забыць свой двор, іх непаўторнае сяброўства і іх вечныя праблемы. Яму нечага не хапае без дзяцей. Хочацца проста пагаварыць, зноў апынуцца на некалькі хвілін у вялікім неадназначным дзіцячым свеце, падобным на двор з яго заблытанымі сцежкамі, з прыцемкамі і яркім святлом альбо на... пачатую казку. Як ні дзіўна, яму да гэтай пары вельмі падабаюцца казкі Г.-Х. Андэрсана. Нядаўна ў Івана нарадзілася дачка. І ён спадзяецца, што хутка будзе распавядаць ёй упадабаныя казкі. Асабліва гэту. «Пра стойкага алавянага салдаціка».**

Калі два гады назад пры Маскоўскім райкоме камсамола і ЖЭСе-14 стварыўся клуб юных дэсантнікаў «Трывога», захопленых аханняў і вохканняў хапала. Пасля адкрыцця клуба не на адным урачыстым і проста сходзе было сказана не адно прачулае слова аб важкім укладзе ў справу патрыятычнага выхавання моладзі, і не адна арганізацыя, меўшая нейкае дачыненне да гэтага самага выхавання, паставіла пэўную адзнаку ў адпаведную графу: хлопцы, прайшоўшыя школу мужнасці і салдацкага братэрства ў Афганістане, перадаюць свой багаты набыты вопыт маладому пакаленню.

Ах. Ох. Эх... Тая абставіна, што яны за сваю працу не атрымліваюць ні капейкі (не ўціскаюцца ні ў якія рамкі аплаты за свае паслугі), і што фактычна яны ўжо два гады працуюць на голым энтузіязме, вядома, у святочныя справаздачы не выносіцца.

*— Аць-два. Аць-два. Левай-правай. Крок наперад. Аб гэтым казачныя алавяныя салдацікі маглі толькі марыць. Родная скрынка не дазваляла. На самай справе яны ўвесь час стаялі на месцы.*

Уладзімір Ерахавец і Багдан Нічыпарук, па чыёй ініцыятыве быў створаны клуб, на месцы не стаялі і стаяць не збіраюцца. У іх і цяпер не перастаюць жыць грандыёзныя па нашых мерках планы. Напрыклад, стварыць сумесна з Маскоўскім райкомам камсамола ў кожнай школе сваю школу. Каб дзеці праходзілі не толькі азы фізічнай падрыхтоўкі і рукапашнага бою, а і такія дысцыпліны, як фарміраванне хлопца, патрыёта, чалавека. Можна запярэчыць: гэта ж функцыі сярэдняй вучэбнай установы. Аляксандр Крывец, першы сакратар Маскоўскага райкома камсамола, засведчыў, што многіх дырэктароў школ Маскоўскага раёна больш хвалюе... колер падлогі ў спартыўнай зале. Маўляў, як бы яна, таго, не аблупілася раней часу ад узмоцненых трэніровак юных дэсантнікаў.

Мары, мары... У «Трывогі» яны аб добрай скураной вялікай баксёрскай «грушы». Аб татамі (у наяўнасці пакуль голая драўляная падлога).Аб больш прасторным памяшканні. Зашмат? Каб можна было зрабіць усё гэта сваімі рукамі, то і марыць не трэба было б. Сцяну трэніровачнага памяшкання, напрыклад, размаляваў начальнік клуба Іван Іхненка.

*У той жа вядомай казцы Г.-Х. Андэрсана сэрца папяровай танцоўшчыцы не вытрымала. І яна кінулася на дапамогу свайму алавянаму салдаціку прама ў полымя.*

«Трывозе» і яму падобным клубам, каб неяк задаволіць свае надзённыя патрэбы, прыходзіцца мець справу з папяровымі душамі. Як сведчаць шматлікія захады ў розныя інстанцыі, і першая фінансавая дапамога клубу прыйшла ад арганізацыі, у якой адсутнічае графа аб патрыятычным выхаванні моладзі Маскоўскага раёна. Затое ў наяўнасці нешта іншае. Зборы са спектакля «Начныя Карлікі і Антыгона» Рускі драматычны тэатр пералічыў на рахунак «Трывогі». Усяго каля дзвюх тысяч рублёў. З фабрыкі імя Куйбышава 10 000 рублёў ужо прыйшлося, як у нас вядзецца, «выбіваць». Астатнія прадпрыемствы, на якіх працуюць таксама і бацькі юных дэсантнікаў, дапамагчы клубу адмовіліся. Хоць, вядома ж, не збяднелі б...

Ініцыятары «Трывогі» маглі б арганізаваць кааператыў. І, безумоўна, не прагарэлі б.

Маглі б «прымацавацца» да якога-небудзь прадпрыемства, як гэта робяць усе астатнія клубы юных дэсантнікаў Мінска. Але тады было б у клубе больш мерапрыемстваў тыпу: тата, мама і я — разам спартыўная сям'я, аб самастойнасці толькі б марылі.

Маглі б увогуле спакойна застацца ў баку ад гэтай зневажаючай чалавечую годнасць бясконцай бойкі за «грушы» і за татамі, за стаўкі для людзей, якія займаюцца патрыятычным выхаваннем сапраўды на справе.

«У іх жа з першых трэніровак паходка мяняецца, голас,— расказвае Іван Іхненка.— І, вядома ж, гонар. Ён — юны дэсантнік. Ён — нешта можа».

Трэніроўка працягваецца паўтары гадзіны. Паўгадзіны «расцяжкі», размінкі. Гадзіна адпрацоўкі ўдараў, блокаў і таго, якое пачынаецца са слоў: «Да бою!» І бясклапотныя хлапечыя твары становяцца засяроджанымі і крышачку ўзрушанымі.

Так хочацца, каб гэта засяроджанасць і ўзрушанасць з'явіліся на тварах усіх тых, хто са спакойным сумленнем патрабуе ад райкомаў камсамола замацавання кожнага члена аператыўнага атрада за «цяжкім» падлеткам. Што гэтае замацаванне на паперы, на жаль, мала каго ўзрушвае.

Як не хвалюе і той факт, што дзіцячая злачыннасць у Маскоўскім раёне значна павысілася ў параўнанні з мінулым годам. Ці, можа, патрэбна камусьці такая «зацікаўленасць», калі ў «Трывогу» раз-пораз прыходзіць участковы міліцыянер і пытае з заклапочаным тварам: «Цяжкія ёсць?» Пасля гэтага, атрымліваецца, Івану Іхненка трэба падыходзіць да кожнага падлетка і пытаць: «Ты «цяжкі» ці не «цяжкі»? І якое гэта замацаванне, калі за кожным затрыманым падлеткам ужо былі замацаваны ў свой час: міліцыя, школа, камсамольская арганізацыя.

*...Аднаногаму алавянаму салдаціку фенаменальна не шанцавала. То вецер з падаконніка скіне, то чорны троль у печку пастараецца зацягнуць.*

Валодзя Ерахавец, цяпер старшыня Асацыяцыі ветэранаў вайны ў Афганістане, сказаў, што, магчыма, пытанне з акладамі інструктарам «Трывогі» вырашыцца станоўча. Хлопцам праз два гады змагання з голым энтузіязмам, можа, пашанцуе. Але асабіста я ў гэтым унікальным па сваёй сутнасці прарыве з сістэмы адносін да развіцця клубаў юных дэсантнікаў мала бачу аптымістычнага. І зачараванае кола (патрэбны клубу спецыялісты з вышэйшай педагагічнай адукацыяй, а хто пойдзе пасля інстытута ці універсітэта на 70—80 інструктарскіх рублёў) застаецца ў поўнай захаванасці.

*«Алавяны салдацік стаяў захоплены полымем: яму было страшэнна горача, ад агню ці ад любві — ён і сам не ведаў. Фарба з яго зусім злезла, ён увесь паліняў. Хто ведае чаго — ад блуканняў ці ад гора? Ён глядзеў на танцоўшчыцу, яна на яго, і ён адчуваў, што растае, але ўсё яшчэ трымаўся стойка, з ружжом на плячы».*

*З казкі Г.-Х. Андэрсана «Стойкі алавяны салдацік».*

Аляксандр Вышагародцаў, Слава Вернікоўскі, Андрэй Чарнышоў, Валянцін Клімаў, Багдан Нічыпарук і Іван Іхненка пакуль трымаюцца. Праўда, з таго першага саставу інструктараў «Трывогі» засталося некалькі чалавек. Адыходзяць людзі. Яны не алавяныя. Ім трэба неяк жыць.

А што будзе, калі не знойдзецца грошай для аплаты іх такой няўдзячнай работы пасля новага года ў Мінскай асацыяцыі ветэранаў вайны ў Афганістане? І калі проста стане немагчыма чакаць і так жыць, праядаць «шлюбныя грошы» (на вяселле маладым падарылі), як робіць гэта Іван Іхненка, ці падрабляць недзе начным вартаўніком?

На вуліцы могуць апынуцца дзвесце падлеткаў, якія займаюцца ў «Трывозе». І хто паручыцца, што паказчык злачыннасці сярод непаўналетніх у Маскоўскім раёне не стане яшчэ вышэйшым?

Яны салдаты. Стойкія. Якім цесна ў створанай намі самімі скрынцы-сістэме. І якія выконваюць свой абавязак на сваім месцы, нягледзячы на недахоп вышэйшай педагагічнай адукацыі. Невядома яшчэ, за якім настаўнікам дзеці «бегаюць» у школе больш, чым за імі ў «Трывозе».

Але яны салдаты. А салдаты, як вядома, падпарадкоўваюцца субардынацыі і вышэйстаячым начальнікам. У даным выпадку ўсёй сістэме адукацыі падлеткаў. Цераз яе параграфы не пераскочыш і яе сцяны не праб'еш. Не ў іх гэта сілах, не ў іх кампетэнцыі.

Яны салдаты. Справа за генераламі.

**«Было калісьці дваццаць пяць алавяных салдацікаў, родных братоў па матулі—старой алавянай лыжцы: ружжо на плячы, галава прама, чырвоны з сінім мундзір — ну, цуд, што за салдаты. Першыя словы, якія яны пачулі, калі адкрылі іх домік-скрынку, былі: «Ах, алавяныя салдацікі!»**

**З казкі Г.-Х. Андэрсана «Стойкі алавяны салдацік».**

А. КОКТЫШ, наш кар.

ШТО БЫЛО!

# «Нас чакаюць...»

**У маёй свядомасці мота- і аўтапрабегі заўсёды асацыіруюцца з Ільфам і Пятровым. Таму для мяне на іх ляжыць адбітак нікчэмнасці і свавольства.**

**Мотапрабег, у якім удзельнічалі прадстаўнікі райкома камсамола сумесна з фальклорным калектывам «Неруш» Белдзяржуніверсітэта па тэрыторыі Польшчы і ГДР, да гэтых дзвюх якасцяў маіх уяўных прабегаў ніякага дачынення не мае. Каб паехаць вітаць нашых салдат, якія праходзяць службу за мяжой, кожнаму ўдзельніку мотапрабега (а іх было восем) прыйшлося перамагчы ў конкурсе, дзе на адно месца прэтэндавала 4—5 чалавек. Паўтары тысячы кіламетраў пройдзены матацыкламі былых канкурсантаў. Калі сказаць, што ў воінскіх часцях іх сустракалі цёпла, значыць, амаль нічога не сказаць. Што ўжо нагадваць рэакцыю палякаў і немцаў, якія таксама прысутнічалі на выступленнях «Неруша» і хлопцаў-афганцаў. Апошнія ў гэтым паходзе складалі амаль палову.**

**Былы воін-інтэрнацыяналіст Уладзімір Ерахавец, па чыёй ініцыятыве і праводзіўся мотапрабег, задумвае яшчэ адзін, ужо па памятных мясцінах Беларусі. Плануецца ўдзел таксама на конкурснай аснове не адна[…] дзесятка маладых людзей, у тым ліку і небяспечных рокераў. Прыбраць магілу невядомага салдата, дапамагчы інвалідам Вялікай Айчыннай і Афганістана, выканаць свае намеры ад душы — гэта пакуль толькі задумкі. Але вынікі замежнага турнэ не даюць падставы сумнявацца ў іх здзяйсненні.**

**— А як накшталт паўторнага наведвання вайсковых часцей у ПНР і ГДР? — спытаў я ў Валодзі.**

**— Нас чакаюць,— коратка адказаў ён.**

**А. АСТАХАЎ.**

СВАБОДНЫ МІКРАФОН

# «Я супраць манаполіі»

**Студэнцкае самакіраванне — больш шырокае паняцце, чым яно трактуецца ў пастанове МінВНУ, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ «Аб першачарговых мерах па пашырэнні ўдзелу студэнтаў у кіраванні ВНУ». Ні адно пытанне студэнцкага жыцця не павінна вырашацца без іх асабістага ўдзелу. Цяпер пра орган самакіравання. Я — за любы дадатковы орган студэнцкага самакіравання, калі ён будзе дзейсны, і — супраць усякай манаполіі камсамола і прафсаюза. Але разам з тым не трэба забываць: большасць студэнтаў з'яўляецца членамі гэтых дзвюх арганізацый і, значыць, нельга аддзяляць самакіраванне ад камсамола і прафсаюза. Сёння эфектыўнасць яго органаў (студэнцкі дэканат і інш.) нізкая, бо яны не маюць рэальных правоў.**

**Лічу, што група студэнтаў у саставе вучонага савета інстытута і факультэта можа стаць паўнапраўным органам, які будзе ўплываць на рашэнне розных пытанняў ВНУ. Ён павінен прадстаўляць у савеце думку студэнтаў, якія яго выбралі. Для гэтага неабходна праводзіць сходы-кансультацыі, анкетаванні, практыкаваць справаздачы членаў вучонага савета перад студэнцкім калектывам і сістэму наказаў. Акрамя гэтага, каб прадстаўнікі студэнтаў у вучоным савеце выступалі адзіным фронтам, трэба загадзя абмяркоўваць пытанні, якія выносяцца на савет, на агульным сходзе.**

**Выбары будучых настаўнікаў у савет інстытута павінны праводзіцца на агульнай канферэнцыі студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў інстытута. Прычым, прадстаўнікі адміністрацыі не абавязкова будуць з'яўляцца яго членамі, хоць, на маю думку, павінны ўдзельнічаць у рабоце.**

**Вядома, узнікае пытанне, як могуць студэнты (іх у савеце 25 працэнтаў) уплываць на рашэнне? Але ў мяне ёсць прыклады, калі будучыя настаўнікі аргументавана даказвалі свой пункт гледжання, а выкладчыкі, у сваю чаргу, падтрымлівалі яго. Такім чынам былі вырашаны праблемы спецсемінараў на гістарычным факультэце і пытанне выбару выкладчыкаў на савеце інстытута.**

**У той жа час я супраць права вета на рашэнні савета, якія датычаць студэнцтва. Любое вета лічу антыдэмакратычным.**

**Сёння студэнты ў саветах інстытута і факультэтаў працуюць дрэнна. А большасць наогул не працуе. Не зразумела, як яны трапілі туды? Гэтыя «прадстаўнікі» не толькі не выказваюць думкі студэнтаў, а часам не маюць сваёй. Між тым ні адзін факультэт не заслухаў справаздачы пра работу членаў савета, не адазваў нікога, хто не справіўся са сваімі абавязкамі, хоць такое права ёсць.**

**І яшчэ некалькі слоў наконт узаемаадносін выкладчыкаў і студэнтаў. Яны, на мой погляд, павінны быць раўнапраўнымі партнёрамі ў рашэнні ўсіх пытанняў у ВНУ. У нас жа гэтыя ўзаемаадносіны будуюцца на прынцыпе «бацькоў і дзяцей».**

**Гаворачы пра самакіраванне ў інтэрнаце, не трэба блытаць яго з самаабслугоўваннем, хоць самаабслугоўванне — рэальная магчымасць атрымання сродкаў на патрэбы «другога дома». Самакіраванне ў інтэрнаце — гэта і не замена ўсіх адміністрацыйных адзінак студэнтамі, а тое, што студэнцкі савет павінен быць гаспадаром у прававых[…] фінансавых і іншых адносі[…]нах.**

**Поспех самакіравання залежыць ад саміх студэнтаў. На жаль, большасць з іх абыякавыя да ўсяго, што адбываецца. І тут намаганняў аднаго актыву мала. Трэба, каб кожная група адчула сваё права ўплываць на ход тых або іншых рашэнняў.**

**І. КАРПЕНКА,**
**сакратар камітэта камсамола МДПІ імя М. Горкага.**

# НАДЗЕЙНАСЦЬ, ЯКАСЦЬ, ПЕРСПЕКТЫВА

Ён зусім яшчэ немаўля. І снежня яму споўніцца толькі адзін год. Але пра сапраўдную сталасць гавораць не гады, а справы, якіх было не так ужо мала. Менш чым за год Цэнтрам навукова-тэхнічнай творчасці моладзі «Пошук» Маскоўскага раёна г. Мінска выканана больш за 200 дагавораў на суму каля мільёна рублёў.

*ШПАРГАЛКА ДЛЯ ЦІКАЎНЫХ: цэнтр НТТМ «Пошук» з'яўляецца формай арганізацыі навукова-тэхнічнай дзейнасці ў рамках адзінай грамадска-дзяржаўнай сістэмы НТТМ. Ён ажыццяўляе пасрэдніцкую місію па ўсталяванню цесных сувязей паміж прадпрыемствамі, арганізацыямі, установамі і творча актыўнай часткай грамадзян з мэтай эфектыўнага выкарыстання навукова-тэхнічнага патэнцыялу і паскарэння ўкаранення перадавых дасягненняў навукі і тэхнікі ў практыку.*

...Гандлёвыя рады, гасцініца, аўтастаянка. Нялёгкая задача была пастаўлена перад цэнтрам: усё павінна быць выканана ў адзіным стылі, не парушыўшы архітэктурнага ансамблю горада. Кожны выказваў свае меркаванні. М. Я. Змітровіч — дырэктар НТТМ, як звычайна, уважліва выслухоўваў прапановы, у кожнай з іх шукаў рацыянальнае зерне і ў думках ужо бачыў выканаўцу. Параіліся і вырашылі прыняць заказ — стварыць праект крытага Чэрвеньскага базара. Ды і як было адмовіцца ад такой заманлівай ідэі? Што ні кажы, а славалюбства ёсць у кожнага: іх тварэнне будзе ўпрыгожваць сталіцу, цешыць вока не толькі жыхароў Мінска, але і яго гасцей.

Я не раздаю авансаў. Калі за справу возьмецца «Пошук», можаце быць упэўнены: тэрміны і якасць работы гарантаваны. Цэнтр не абмяжоўваецца толькі пошукамі выканаўцы. Ён абавязкова кантралюе работу. А каб у заказчыка зусім не заставалася сумненняў, зараз тут думаюць аб увядзенні ўнутранай экспертызы праектаў. Яе будуць ажыццяўляць высокакваліфікаваныя спецыялісты.

*ШПАРГАЛКА ДЛЯ ЦІКАЎНЫХ: Цэнт НТТМ мае ўласную маёмасць, самастойны баланс, пячаць. Ён з'яўляецца юрыдычнай асобай і будуе сваю дзейнасць на аснове гаспадарчага разліку і самафінансавання.*

Сёння цэнтр навукова-тэхнічнай творчасці моладзі — гэта дваццаць пяць чалавек (па штатнаму раскладу). Безумоўна, яны не ў стане выканаць увесь аб'ём работ. Ды ў гэтым і няма патрэбы. Галоўная задача цэнтра — дапамагчы энтузіястам рэалізаваць свой творчы патэнцыял, свае ідэі і прафесійныя якасці. Тут разумеюць, што зносіны з калегамі і аднадумцамі садзейнічаюць набыццю дзелавой хваткі, навыкаў гаспадарання, павышэнню інтэлектуальнага ўзроўню. Менавіта таму ў «Пошука» так многа «пазаштатных» работнікаў — каля 900 чалавек. На жаль, хоць сама назва цэнтра гаворыць, што ён створаны для моладзі, тым не менш хацелася б, каб форма больш адпавядала зместу, бо маладых людзей тут не так ужо і многа.

— Мы выконваем складаныя і адказныя заданні,— растлумачыў у гутарцы са мной М. Я. Змітровіч.— І каб справіцца з імі, патрэбны вопыт, навыкі, прафесіяналізм. Моладзі часам гэтага не стае. Таму прапануем ім на першым часе працаваць, як кажуць, у сааўтарстве з вопытнымі спецыялістамі, вучыцца ў іх, пераймаць майстэрства. Думаем, хутка знойдзецца справа і для моладзі. У гэтым дапаможа адкрыццё камп'ютэрнага клуба. Зараз вядуцца перагаворы са студэнтамі з РТІ, БДУ. У будучым мяркуем пашыраць навукова-даследчую работу — тут таксама патрэбны ініцыятыва і дапытлівасць маладых.

*ШПАРГАЛКА ДЛЯ ЦІКАЎНЫХ: Гаспадарчая дзейнасць цэнтра НТТМ будуецца на аснове планаў, зацверджаных яго дырэктарам і ўзгодненых з каардынацыйным саветам, складзеных з улікам аб'ёмаў работ па прамых дагаворах: цэнтр НТТМ — прадпрыемства, арганізацыя, установа.*

*Дагавор з'яўляецца асноўным дакументам, які рэгламентуе адносіны цэнтра з заказчыкам.*

«Цэнтр ногі кормяць»,— так, перафразіраваўшы вядомую прыказку, можна даволі дакладна сказаць аб рабоце членаў «Пошука». Седзячы на месцы нічога не зробіш. І справа не ў тым, што цэнтру не давяраюць — многія пра яго проста не ведаюць. Каб дзейнасць была больш эфектыўнай, тут прапануюць свае паслугі самі: шукаюць заказчыка, зводзяць яго з выканаўцам, займаюцца шматлікімі падрыхтоўчымі пытаннямі.

Якія ж віды работ могуць быць выкананы пры садзеянні цэнтра? У яго Статуце сказана, што асноўная функцыя — пасрэдніцкая. Але рос «актыў» «Пошука», пашыраліся яго магчымасці. І зараз тут можна зрабіць заказы на выкананне мантажных, наладачных, праектных работ. Дарэчы, апошнія — аснова ўсёй дзейнасці. Прамысловыя аб'екты і спартыўныя збудаванні, жылыя дамы і газаправоды, аўтадарогі і цеплатрасы. Калі вы пажадаеце наладзіць кантакт з «Пошукам», то вам прапануюць распрацоўкі, ужо гатовыя да ўкаранення. Сярод іх радыёэлектронная сістэма ахоўнай сігналізацыі, аўтаматызаваная сістэма вадзянога ацяплення, новае тэхнічнае вырашэнне ізаляцыйных канструкцый з выкарыстаннем матэрыялу рыпор.

Гэта — з перспектывай. А што зроблена сёння?

Шмат дагавораў заключана з Мінскімі прадпрыемствамі. Выканалі комплекс работ па мантажу і наладцы абсталявання на аб'яднанні «Мінскхлебпром», правялі рэканструкцыю газавых сетак у грузавым аўтапарку № 1, распрацавалі сістэму вентыляцыі для МАЗа... Асабліва цесныя канстакты з Мінскім трактарным заводам — спонсарам НТТМ. Ёсць заказчыкі і ў Маскве, на Украіне, у Казахстане, Прыбалтыцы. У будучым плануюць наладзіць сувязі і з замежнымі краінамі.

Цэнтр НТТМ «Пошук» — не адзіная такога роду арганізацыя ў Мінску. Ці адрозніваецца ён чым-небудзь ад сваіх «сабратоў»? Безумоўна. І не толькі тым, што тут здолелі дабіцца такога -сякога памяшкання (аж з шасцю тэлефонамі!) для размяшчэння сваіх службаў. Бадай, толькі «Пошук» мае афіцыйны дазвол Дзяржкамгаза на праектаванне сетак газазабеспячэння. Заручыліся і паперай у Інспекцыі дзяржаўнага геадэзічнага нагляду. Гэта дае магчымасць праводзіць тапагеадэзічныя выпрабаванні.

— Калі б вам прапанавалі прарэкламаваць свой цэнтр, як бы вы зрабілі гэта? — спытала ў сваіх субяседнікаў М. Я. Змітровіча і яго намесніка па вытворчасці А. М. Барталевіча.

— Цэнтр НТТМ «Пошук»— гэта надзейнасць, якасць, пераспектыва.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

НАЗЫВАЕМ ПРАБЛЕМУ

# Пра хлопчыка, якога навучылі лятаць

*Мы гаворым «дзеці», «хлопчыкі», не здагадваючыся (пры ўсёй нашай адукаванасці не здагадваючыся), што словы гэтыя даўно страцілі множны лік у незлічоным россыпу адзінак.*

*Р. М. РЫЛЬКЕ.*

Ён, між іншым паскардзяцца вам, наогул некіруемы: можа без дай прычыны ўсміхацца палову ўрока, каб пазбавіць працоўнага настрою ўвесь клас і вывесці з раўнавагі настаўніцу. Нічога сабе жартачкі! Можа прыхапіць разам з падручнікамі і сшыткамі цацку і ў час самастойнай работы неўзабаве заняцца гульнёй. Знайшоў месца і час!

Ён на многае яшчэ, кажуць, здольны: менавіта ад яго далонек, запэцканых кашай, на дэфіцытнай секцыі засталіся непажаданыя пляміны, не без яго актыўнага ўдзелу новыя шпалеры ператварыліся ў чорт ведае што.

І каму да таго справа, што ўсе яго штукі ні ў якім разе не хуліганскія махлярствы, а цяга да малявання — натуральная патрэба творчасці? І дзе знайсці яму справядлівага і чулага Шаталава, які б запэўніў астатніх дарослых: «Прыродная адоранасць цалкам ніяк не суадносіцца з поспехамі ў вучобе, адлюстраванымі ў класных журналах і ведамасцях»?



Формула дзіцячага жыцця выводзілася дарослымі. З вышыні іх узросту лёгка канстатаваць, што можна і што нельга, што добра і дрэнна, што станоўча і абуральна. Няўважлівы? Саслаць на апошнюю парту! Задае надакучлівыя пытанні? Папікнуць тым, што перашкаджае. А хто спрабаваў апынуцца на месцы дзіцяці, зразумець, чаму не выконвае яно нашы просьбы і загады? Зразумела, не настаўніца: у яе такіх 30—40 чалавек у класе, паспець бы растлумачыць, апытаць, сшыткі праверыць... Безумоўна, не бацька: па тэлевізары паказваюць футбол, а ў сына з машынкай нешта здарылася. І, самі разумееце, не маці: адзець, накарміць, прыкрыкнуць — гэта ў яе кампетэнцыі. Магчыма, нават не ў недахопе часу справа, а ў нашай нязгодзе з тым, што дзіця таксама асоба, якая мае права на ўласнае меркаванне.

Прысуд у неардынарнасці цяжэйшы за ўсе астатнія. Ім «стрыгуць» пад пасрэднасць.

Дарослым лёгка дыхалася, бесклапотна жылося менавіта ў тую хвіліну, калі хлопчык перастаў лятаць. Нават у сне. Ён натыкаўся на непераадольныя горы папярэджванняў: «нельга», «не смей», «не замінай»...

Крылы міжволі апускаліся...

Другі паверх будынка ЖЭСа № 90, што па Алібегава, 25, называюць па-рознаму. Афіцыйна гэта цэнтр эстэтычнага выхавання, тэхнічнай творчасці і масавага спорту Маскоўскага раёна. Зыходзячы з мэт кіраўніцтва і супрацоўнікаў, гэта цэнтр вырастання дзіцячых душ. Для наведвальнікаў (у два-тры гады назва цэнтра гучыць больш мудрагеліста, чым незразумелае для дарослых слова «абракадабра») — гэта астравок незвычайных прыгод, дзе развенчваюцца ўсе стэрэатыпы. Тут можна на першым дваццацімінутным уроку глядзець «мульцікі», на другім — слухаць казку (як і тлумачэнні выкладчыка), лежачы на дыване, на трэцім — паслухаць музыку разам з любімай лялькай, а пасля заняткаў не трэба будзе выконваць дамашняе заданне.



— Будучае,— упэўнены генеральны дырэктар цэнтра Сяргей Клімавіч Дамашэвіч,— менавіта за цэнтрамі комплекснага выхавання. Праўда, культура не можа існаваць на бацькоўскія грошы, таму над намі гэтая пяцёрка — месячны ўзнос за адно дзіця — вісіць дамоклавым мячом.

Дзесятага верасня адкрыўся цэнтр эстэтычнага выхавання па вуліцы Алібегава. Утульнасць і прывабнасць пакояў дасягнута стараннем выхавацеляў. Вясёлку на сценах у былым цьмяным калідорчыку стварылі малюнкі пычынаючых мастакоў. Сярод выхаванцаў не выдзяляюць дасягнуўшых вялікага поспеху і гультаёў: усе чытаюць, усе малююць, усе танцуюць, усе фантазіруюць і маюць ролі ў тэатры. Жыццё наладжваецца. Але шмат яшчэ недаробленага.

Размалявалі дзверы аднаго пакойчыка і назву яму далі — «Барчык». Толькі па-ранейшаму ні сокаў, ні марожанага не паспытаеш — для набыцця абсталявання няма грошай.

Марыць аб запрашэнні на работу ўрача-псіхолага і ўрача-тэрапеўта — няма грошай.

Выйсце, безумоўна, шукаюць.

Камерцыя ў нашым выкананні — гэта фінансавая падтрымка цэнтра і ўдзел падлеткаў у працоўнай дзейнасці,— тлумачыць камерцыйны дырэктар Сяргей Віктаравіч Антонаў.

Дзяўчаты, якія займаюцца ў гуртку кройкі і шыцця, не толькі для сябе грошы атрымліваюць, але і пералічваюць 10 працэнтаў на развіццё цэнтра.

Цэнтр стварыўся ў дадатак да ўстаноў існуючай сістэмы навучання. Тым больш нечаканымі былі для групы энтузіястаў непаразуменні са школай. Новае раздражняе, яно кранае самалюбства, выклікае рэўнасць, імкненне вытрымаць прынцып. Супрацоўнікі цэнтра чужых функцый сабе не прысвойвалі, усведамлялі і другое: разлічваць на дастаткова поўнае духоўнае выхаванне ў сценах школы пры існуючых педагагічных штатах і вучэбных плошчах пакуль бесперспектыўна. Але спадзявацца, што да іх меркаванняў прыслухаюцца, ім паспрабуюць дапамагчы хаця б на першым часе, ёсць у іх такое права. І, аказваецца, пакуль няма.





...Хлопчык пакідае свет, дзе ніхто не перашкаджаў яму заставацца самім сабой. Ён — раслінка падатлівая, але не толькі да добрага. За дзвярыма — вуліца, сям'я, школа. Хлопчык паверыў у свае сілы. Не перашкаджайце яму лятаць!

З. МАРАВА.

НЕАДКЛАДНА!

# МЫ НАШ, МЫ НОВЫ... або Праграма «мірнага перавароту»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

**В. ШАДУРСКІ:** Дае магчымасць знайсці сабе палітычных аднадумцаў.

**С. ШАПРАН:** Я б іх знайшоў сам і не толькі ў камсамоле.

**В. ШАДУРСКІ:** Так. Але любая арганізацыя мае шэраг пераваг перад неарганізаванай групай людзей. Мы маем магчымасць, скажам, уплываць на грамадскае жыццё універсітэта, на вучэбны працэс. Мы арганізоўваем працоўную дзейнасць камсамольцаў. А адпачынак... Дыскатэкі, клубы, сустрэчы — усё камсамольскія справы. У нас ёсць матэрыяльная база. У нас ёсць вопыт у рэшце рэшт.

**КАРЭСПАНДЭНТ:** Каб валодаць розумам і душамі маладых людзей, сэння гэтага недастаткова.

**В. ШАДУРСКІ:** Пагоня за колькасцю, што ішла ўсе гэтыя гады ў камсамоле, прывяла яго да крызісу. Сёння мы робім стаўку на зацікаўленых, на тых, каму патрэбен камсамол, яго ідэі. Сілком насаджаць свае ідэі мы не збіраемся. Згубім масавасць? Магчыма. Аднак набудзем сапраўдную арганізацыю. Няхай замест некалькіх тысяч будзе некалькі соцень, але аднадумцаў. Мы рэалісты, мы не абяцаем моладзі, што сёння ж перавернем жыццё, зробім яго лепшым. Мы зыходзім са сваіх рэальных магчымасцей і дэкларуем іх. Інакш зараз нельга. Як нельга дайсці да кожнага, растурхаць вялікае соннае царства моладзі. Але тым, хто застанецца з намі, хто прыйдзе да нас, мы абавязаны дапамагчы. З імі мы і будзем мяняць свет.

І яшчэ. Памятаю, на сустрэчы з Данчыкам ва універсітэце мне як прадстаўніку арганізатараў далі заключнае слова. Нефармалы сустрэлі мяне свістам. Вядома, прыкры і крыўдны выпадак. Хоць зрэшты справа не ў нефармалах. Сам свіст — своеасаблівы пратэст супраць камсамола, вотум недаверу ВЛКСМ. За мінулыя памылкі і няўдачы, за сённяшнія праблемы. Але ж мы іх усвядомілі, зрабілі належныя вывады, выбралі новы курс. Новую мадэль камуністычнага саюза моладзі.

Падрыхтаваў
М. МАСТОЎСКІ.

## У цэнтры ўвагі — «Унікон»

На працягу двух лістападаўскіх дзён на базе кафедры кібернетыкі БДУ імя У. І. Леніна праходзіла рэспубліканская навукова-тэхнічная канферэнцыя «Новыя напрамкі развіцця сістэм кіравання для прамысловай робататэхнікі і станочнага абсталявання». Арганізатарамі яе выступілі: БДУ імя У. І. Леніна, навукова-вытворчае аб'яднанне «Гранат», Беларускае рэспубліканскае праўленне Усесаюзнага навукова-тэхнічнага таварыства радыётэхнікі, электронікі і сувязі імя А. С. Папова, БелНДІНТІ Дзяржплана БССР.

На канферэнцыі шырока абмяркоўваліся пытанні стварэння сучасных мікрапрацэсарных сістэм кіравання электрамеханічных робатаў, распрацоўкі алгарытмічнага і праграмнага забеспячэння робататэхнічных сістэм. На пяці секцыях, што працавалі на канферэнцыі, заслухана больш за 90 дакладаў і паведамленняў вядучых спецыялістаў і навуковых супрацоўнікаў НВО «Гранат» (г. Мінск), ВА «Тэхнапрылада» (г. Магілёў), Інстытута прыкладной фізікі АН БССР, МРТІ, БПІ, Інстытута машыназнаўства АН СССР, АўтаВАЗа (г. Тальяці) і інш.

Выкладанню новых канцэпцый стварэння мікрапрацэсарных выканаўчых падсістэм кіравання электрамеханічных робатаў быў прысвечаны даклад доктара тэхнічных навук, прафесара А. С. Міхалёва. З цікавасцю выслухана паведамленне намесніка генеральнага дырэктара НВА «Гранат», кандыдата тэхнічных навук Н. Н. Немагая аб перспектыўных распрацоўках мікрапрацэсарных сістэм кіравання сямейства «Сфера».

Бясспрэчна, у цэнтры ўвагі на канферэнцыі знаходзіўся распрацаваны на кафедры кібернетыкі ўніфікаваны мікрапрацэсарны кантролер «УНІКОН» для выканаўчых падсістэм робатаў і станочнага абсталявання. Дадзены кантролер валодае высокімі эксплуатацыйнымі якасцямі, патэнтнай частатой. Зараз у СКТБ з ВВ пры універсітэце зроблены выпуск эксперыментальнай партыі кантролераў.

У рэкамендацыях канферэнцыі прынята рашэнне аб рэгулярным правядзенні рэспубліканскіх навукова-тэхнічных канферэнцый, прысвечаных пытанням робататэхнікі і гібкіх вытворчых сістэм.

В. МАЛАФЕЕЎ,
асістэнт кафедры кібернетыкі.

## Калі ласка, беларуская мова!

1 лістапада адбыўся ўстаноўчы сход Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны Белдзяржуніверсітэта. Прадстаўнікоў розных факультэтаў, вучоных і студэнтаў сабраў агульны клопат пра родную мову. На сходзе была створана універсітэцкая суполка ТБМ, прыняты асноўныя палажэнні праграмы па адраджэнню беларускай мовы ў БДУ, а таксама зварот да Вярхоўнага Савета БССР. Была абрана рада ТБМ у саставе 20 чалавек. На першым арганізацыйным пасяджэнні рады яе старшынёй стаў вядомы беларускі вучоны, член-карэспандэнт АН БССР, загадчык кафедры беларускай літаратуры Алег Антонавіч Лойка, намеснікамі — дацэнт фізфака В. К. Ахраменка, загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры для нефілалагічных факультэтаў У. А. Навумовіч і студэнтка гістарычнага факультэта Н. Аладзьева. Створаны наступныя камісіі, якія ахопліваюць розныя напрамкі дзейнасці ТБМ ва універсітэце: арганізацыйная, прапагандысцкая, па арганізацыі навучання беларускай мове, тэрміналагічная, па арганізацыі міжнароднага семінара беларускай мовы.

Л. ТАРАСЮК.

## Дзень бібліяграфіі

па прыродазнаўчых навуках праводзіць 17 лістапада бібліятэка БДУ імя У. І. Леніна. Наведаўшы навуковы абанемент (галоўны корпус, 2-гі паверх), вы зможаце пазнаёміцца з бібліяграфічнымі і даведачнымі выданнямі па матэматыцы, фізіцы, хіміі і біялогіі.

Т. МІЦЮХІНА.

## НАШЫ ПЕ-РА-МАГ-ЛІ!



Пераказваць тое, што гучала на апошняй чвэрцьфінальнай сустрэчы клуба вясёлых і знаходлівых у Доме палітычнай асветы, — справа няўдзячная. Паядынак фаварыта публікі — каманды КВЗ універсітэта — і зборнай клуба трэба слухаць самому і бачыць на ўласныя вочы. Тыя, каму ў гэтым пашчасціла, здаровым смехам падоўжылі сваё жыццё не меней чым на год. А балельшчыкі універсітэцкай каманды яшчэ больш, бо іх вясёлыя і знаходлівыя перамаглі!

Фота С. ГРЫЦА.



НАДЗВЫЧАЙНАЕ ЗДАРЭННЕ

## Што мне даў камсамол?

«Прашу выключыць мяне з камсамола ў сувязі з поўнай стратай яго аўтарытэту ў маіх вачах...».

«...па асабістаму жаданню».

«...з-за недастатковасці перакананняў».

«...з-за таго, што я не згодзен плаціць членскія ўзносы».

Маладыя людзі пакідаюць камсамол. Ці камсамол пакідае іх? Адбываецца гэта паўсюдна. Напрыклад — на заводзе «Калібр».

Усе яны гавораць, што некамсамольцамі адчуваюць сябе цудоўна і ўпэўнены, што ніколі не пашкадуюць аб сваім учынку. Адносіны з начальствам не змяніліся. З суседзямі па канвееру тым больш: тыя ж дружна прагаласавалі за выхад з камсамола ўсіх, хто да гэтага імкнуўся, калі разглядалі іх заявы на сходзе.

З красавіка 1985 года яны паспелі навучыцца жыць без апекі кіраўнікоў, самастойна адмаўляцца ад яе. І сённяшнія іх рашучыя дзеянні — як апраўданне за ўчарашнія. Дазволілі ж яны, напрыклад, некалі «загнаць» сябе ў камсамол:

«Я ў вучылішчы была адзінай некамсамолкай ў групе, вось мяне і прымусілі ўступіць...»

«Я ведаў, што не паступлю ў інстытут, калі не буду членам ВЛКСМ. Дык хіба гэта не сапраўдны прымус?»

Але чатырох год аказалася мала, каб навучыцца не толькі гучна грукаць дзвярыма, але і аргументавана пераконваць у правільнасці свайго ўчынку тых, хто застаецца за гэтымі дзвярыма.

Яны выйшлі з ВЛКСМ, і ўсё. Іншая арганізацыя ім не патрэбна.

За штампаванымі радкамі заяў (сярод іх ёсць па пяць абсалютна аднолькавых, быццам пад капірку напісаных) часам утойваюцца такія ж неарыгінальныя меркаванні, хоць сустракаюцца і іншыя:

«Я вучуся ў тэхнікуме, вечарам у мяне заняткі, і заставацца на сходы я не магу. Мы з сакратаром унутрыцэхавай камсамольскай арганізацыі не аднойчы сварыліся з-за гэтага. І ў рэшце рэшт я проста пайшла на прынцып — напісала заяву...»

«Што мне даў камсамол? Вунь Светка паездзіла па розных пуцёўках. А я нічога не атрымала...»

«Зараз ужо само слова «камсамол» выклікае адмоўную рэакцыю. Адзін фільм «ЧП раённага маштаба» чаго каштуе. Дык чаму мы павінны плаціць узносы — карміць апаратчыкаў?»

«Наш камсамол — безгаловы, бо ён пад партыяй ходзіць і ніколі не здолее не падпарадкавацца ёй. Не разумею, чаму ўсе высокія камсамольскія кіраўнікі — людзі некамсамольскага ўзросту...»

Адна з найбольш распаўсюджаных прычын жадання «вызваліцца» ад камсамола — грашовая. Яны ж, грошы, дакладней, фінансавая несамастойнасць камсамольскіх арганізацый,— з ліку тых фактараў, якія прывялі да ўзнікнення такога жадання сярод моладзі. Вячаслаў Ларчанка, сакратар камсамольскай арганізацыі «Калібра», перакананы ў гэтым. І менавіта магчымасць мець грошы і самастойна выкарыстоўваць іх лічыць вялікай падтрымкай для аднаўлення аўтарытэта камсамола.

Але на справе гэтаму аднаўленню шмат што перашкаджае. Толькі 15 працэнтаў узносаў застаецца камсамольцам прадпрыемства. А вось каб пакідалі ўсе сто... Галоўная мэта зараз — цэнтр адпачынку для моладзі «Калібра». Ужо і будынак прыгледзелі, і яго чатыры паверхі размеркавалі (пакуль толькі ў планах): на першым будзе зала цяжкай атлетыкі, на другім — відэазала, на трэцім — камп'ютэрная, на чацвёртым — лабараторыя тэхнічнай творчасці. Адміністрацыя прадпрыемства адмовілася выдзяліць грошы на гэтую справу, і камітэт камсамола вымушаны зарабляць іх з дапамогай перасовачнай відэаўстаноўкі. Знойдуцца і іншыя спосабы, вось толькі цікавая перспектыва маладзёжнага цэнтра застаецца аддаленай...

...За апошнія сем месяцаў ад работнікаў «Калібра» паступіла каля 20 заяў аб выхадзе з членаў ВЛКСМ. У камітэце камсамола разумеюць, што гэты працэс будзе працягвацца і некалі замест сённяшніх васьмісот камсамольцаў на прадпрыемстве застанецца можа якіх трыста. Самых лепшых, самых надзейных і перакананых? Не абавязкова. Вось меркаванне аднаго з тых, хто збіраецца застацца:

«Я разумею тых, хто выходзіць з камсамола. Але сам не зраблю гэтага. Чаму? Нярэдка даводзіцца звяртацца да таго ж начальніка цэха, напрыклад, калі трэба раней з работы пайсці. Як жа я падыйду да яго, калі буду некамсамольцам? А так — калі ласка, з любой просьбай падыходзь».

...Яны выходзяць з прахадной і рухаюцца насустрач іншым натоўпам. Вунь крочыць мужчына, які сёння ўпершыню ў жыцці павысіў голас на дырэктара. А тая група людзей нядаўна напісала свой першы ліст у рэдакцыю цэнтральнай газеты і не пабаялася падпісацца асабістымі прозвішчамі...

Мы ўсё часцей бачым навокал рашучыя дзеянні. Вось толькі іх смеласць часам суседнічае з нахабнасцю. На змену старому ідэалу — справядлівасці — усё больш прыходзіць новы — грошы, унутраная свабода людзей спадарожнічае знешняму цынізму. А вяртанне да нас чалавечай годнасці не заўсёды абыходзіцца без засілля чыста спажывецкіх імкненняў.

Тыя, хто пакінуў камсамол, часта адказваюць на пытанне аб тым, што яны яму далі, адназначна: «Многа-многа грошай». А што адкажуць на гэта ж пытанне тыя, хто працягвае спяваць: «Не расстанусь с комсомолом, буду вечно молодым!»?

В. БЯГУН.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПЛ імя Я. Коласа.
16 лістапада
Зак. 1636.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.